УДК 378-057.875:811.161.3

Р.В. Міксюк

# ВЫХАВАЎЧЫ АСПЕКТ НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Выхаванне чалавека было складаным і супярэчлівым працэсам ва ўсе часы існавання грамадства. Для фарміравання светапогляду новага пакалення сучасная сістэма выхавання патрабуе актуалізацыі формаў, мабілізацыі наяўных рэсурсаў, распрацоўкі новых падыходаў, тэхналогій, інавацый. На выкладчыка вну кладзецца вялікая адказнасць за выхаванне моладзі.

Выхаванне духоўна-маральнай асобы, грамадзяніна і патрыёта прадугледжвае ўсе магчымыя накірункі: 1. Культурна-гістарычны (вывучэнне гістарычнага мінулага народа, сваёй сям’і, засваенне культурных дасягненняў); 2. Маральна-эстэтычны (выхаванне маральных якасцей асобы, эстэтычнай культуры); 3. Этнакультурны (вывучэнне хрысціянскіх традыцый, святаў, абрадаў). 4. Экалагічны.

Родная мова з’яўляецца асноўным носьбітам духоўнай культуры народа. Ужо на першых занятках можа быць распачата праца па патрыятычным выхаванні. Студэнтам даецца заданне запісаць у алфавітным парадку прозвішчы знакамітых людзей Беларусі (асветнікаў, вучоных, мастакоў, герояў Вялікай Айчыннай вайны і г. д.), пра якіх пазней будуць напісаны рэфераты, зроблены вусныя выказванні. Значную ролю адыгрывае музычнае і выяўленчае мастацтва. Паказ карцін М.Савіцкага “Лічбы на сэрцы”, прагляд і аналіз плакатаў ваеннай пары, праслухоўванне песень ваенных гадоў знаёмяць з мастакамі, кампазітарамі, аўтарамі песень, зместам твораў, дзе падаецца жыццё, мужнасць, вернасць людзей, іх духоўны стан.

Перспектыўным накірункам выхаваўчай працы з’яўляецца краязнаўчы матэрыял, які патрабуе пошукавай дзейнасці па вывучэнні гісторыі роднага краю. Студэнты рыхтуюць паведамленні па тэмах: “Мая малая Радзіма”, “Лёс маёй вёскі ў час Вялікай Айчыннай вайны”, “Лёс маёй сям’і ў гады вайны”, “Тапонімы майго раёна”, “Храмы і манастыры Беларусі”, “Беларускае вяселле”, “Легенды майго краю” і іншыя. Мэта працы выкладчыка – узняць у вачах моладзі гонар за свой край, за слаўныя перамогі, за яго выдатных людзей.

Такім чынам, адзначым, што выхаванне павінна ажыццяўляцца па розных накірунках і не толькі на занятках, а і праз узаемадзеянне устаноў адукацыі, сям’і і соцыуму, што дазволіць сфарміраваць у моладзі ўстойлівыя ўяўленні аб міры, грамадстве, дзяржаве, аб сваёй краіне і яе культуры.